# 6. СОВРЕМЕННЫЕ ТЕНДЕНЦИИ РАЗВИТИЯ НАЧАЛЬНОГО ОБРАЗОВАНИЯ

УДК 37.016

## СПЕЦЫФІКА АРГАНІЗАЦЫІ РАБОТЫ НАД ПРАЕКТАМ І СТУПЕНІ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ

Д. Д. Гуцава
*УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»;*
*Мінск (Рэспубліка Беларусь)*
*Навуковы кіраўнік – А. С. Васілеўская, к.філ.н., дацэнт*

## THE SPECIFICS OF THE ORGANIZATION OF WORK ON THE PROJECT AT THE FIRST STAGE OF GENERAL SECONDARY EDUCATION

D. D. Gutseva
*Belarusian State Pedagogical University named of Maxim Tank;*
*Minsk (Republic of Belarus)*
*Scientific supervisor – A. S. Vasilevskaya, PhD, Associate Professor*

Артыкул прысвечаны праблеме арганізацыі праектнай дзейнасці на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Аўтар акцэнтуе ўвагу на асаблівасцях рэалізацыі праектаў малодшымі школьнікамі, адзначае праблемы, з якімі можа сутыкнуцца настаўнік пры арганізацыі работы над праектам.

The article is devoted to the problem of organizing project activities at the first stage of general secondary education. The author focuses on the specifics of the implementation of projects by younger schoolchildren, notes the problems that a teacher may face when organizing work on a project.

Ключавыя словы: лінгвакультуралагічная кампетэнцыя; творчае мысленне; праект; праектная дзейнасць; малодшыя школьнікі; героі міфаў.

Keywords: linguistic and cultural compilation; creative thinking; project; project activity; primary school students; heroes of myths.

Сучасныя рэаліі нярэдка патрабуюць ад чалавека творчага падыходу да праблемы, умення вучыцца на працягу ўсяго жыцця, знаходзіць нестандартныя рашэнні разнастайных пытанняў. Таму кожнаму з нас неабходна ўменне творча мысліць.

Развіццё творчага мыслення магчыма толькі праз сістэму творчых заданняў, у працэсе выканання якіх дзіця стварае нешта новае, шукае нетрадыцыйныя

шляхі вырашэння задач, выкарыстоўвае сваё ўяўленне, рэалізуючы тым самым свой асобасны патэнцыял.

Метад праектаў з’яўляецца адным з метадаў, які аб’ядноўвае ў сабе розныя віды творчых практыкаванняў і мае патэнцыял для фарміравання моўнай, маўленчай, лінгвакультуралагічнай кампетэнцый і індывідуалізацыі навучання. Праектная дзейнасць школьнікаў прадугледжвае іх актыўнасць і можа рэалізоўвацца як на ўроку, так і ў пазаўрочнай рабоце.

Аднак арганізацыя праектнай дзейнасці патрабуе ад настаўніка папярэдняй падрыхтоўкі.

У метадычнай літаратуры сфармуляваны правілы для настаўніка, які вырашыў рэалізаваць праектную дзейнасць [1, с. 42]:

1. Настаўнік сам выбірае, будзе ці не ён працаваць па метадзе праектаў.

2. Настаўнік цалкам адказвае за дзяцей, якія ўдзельнічаюць у праекце.

3. Настаўнік давярае вучням, лічыць іх раўнапраўнымі ўдзельнікамі агульнай стваральнай працы.

4. Настаўнік дае магчымасці дзецям для самастойнай працы.

5. Настаўнік выконвае ролю памочніка.

6. Настаўнік сочыць за сваім маўленнем (не «Ты зрабіў няправільна!», а «Чаму ты гэта зрабіў так?").

7. Настаўнік ўмешваецца ў самастойную працу дзяцей толькі тады, калі гэтага патрабуюць абставіны або самі вучні просяць пра гэта.

Настаўніку абавязкова трэба ведаць асноўныя патрабаванні да самога навучальнага праекта [2, с. 21].

1. У праекце павінна вырашацца сацыяльна значная задача (праблема) – даследчая, інфармацыйная, практычная. Далейшая праца накіравана на вырашэнне дадзенай праблемы. Так, галоўнай мэтай праекта «Героі беларускіх міфаў» стала атрыманне ведаў пра беларускую міфалогію, пашырэнне кругагляду, развіццё лінгвакультуралагічнай кампетэнцыі і развіцце творчых здольнасцей. На наш погляд, гэта вельмі важна для сучаснай школы, бо і дзецям, і дарослым не хапае ведаў пра беларускую культуру.

2. Неабходна планаваць дзеянні па вырашэнні праблемы, вылучаць этапы праекта. Разбіццё працы на этапы дапамагае ўпарадкаваць працэс выканання праекта, павысіць эфектыўнасць кіравання. Гэта не толькі важны пункт у рэалізацыі праектнай дзейнасці, але дзейнасць, накіраваная на фарміраванне агульных кампетэнцый. Вылучэнне этапаў дазваляе на кожным з іх акрэсліць свае мэты і задачы, што дае магчымасць палегчыць кантроль за выкананнем праекта, больш дакладна спланаваць паслядоўнасць дзеянняў. Пры завяршэнні

кожнага этапа можна правесці ацэнку выкананай працы і рэфлексію, што дапамагае выправіць памылкі і накіраваць далейшую працу вучняў.

3. Рэалізацыя праекта прадугледжвае даследчую работу (пошук інфармацыі) навучэнцаў. У пачатковых класах вучні яшчэ не ўмеюць працаваць з навукова-пазнавальнай літаратурай, вылучаць галоўнае, сістэматызаваць, рабіць абагульненні, планаваць сваю дзейнасць, яны толькі прыступаюць да пошукава-даследчай работы. Таму вельмі важная роля належыць настаўнікам, супрацоўнікам бібліятэкі, бацькам. Пры рэалізацыі праекта «Героі беларускіх міфаў» узніклі цяжкасці, звязаныя з невялікай колькасцю звестак па тэме і з пошукам дакладнай інфармацыі. Каб дапамагчы вучням знайсці патрэбную інфармацыю, кіраўнікі праекта прапанавалі літаратуру і інтэрнэт-рэсурсы, якія падыходзяць для вырашэння задач праекта.

4. Вынікам работы павінен з'яўляцца пэўны прадукт. Стварэнне прадукта дазваляе ацаніць выкананую працу праз адпаведнасць прадукта пастаўленым мэтам і задачам праекта. А прадстаўленне прадукта патрабуе ад вучняў навыкаў публічных выступленняў, прэзентацыі інфармацыі і зносін з аўдыторыяй. Гэта дапамагае развіваць камунікатыўныя навыкі і ўпэўненасць у сабе. Паказ вынікаў праектнай дзейнасці адкрывае магчымасць для атрымання зваротнай сувязі ад настаўнікаў, аднакласнікаў і іншых удзельнікаў праекта. Гэта дапамагае выявіць моцныя і слабыя бакі працы, атрымаць рэкамендацыі па яе паляпшэнні і развіцці.

Прадстаўленне прадукта дапамагае закрыць праект, падвесці вынікі і ўсвядоміць свае дасягненні. Гэта важны этап у навучальным працэсе, які дазваляе навучэнцам адчуць задавальненне ад завяршэння працы і атрымаць новы вопыт. Так, у выніку рэалізацыі праекта «Героі беларускіх міфаў» малодшыя школьнікі стварылі макеты асяроддзя, у якім жывуць Вадзянік, Дамавік, Еўнік, Лесавік і іншыя істоты, стварылі партрэтную галерэю міфічных істот, выкарыстаўшы для гэтага розныя матэрыялы.

Адрозненне праектнага навучання ад традыцыйнага заключаецца ў тым, што даследчая тэма праекта не падобная да тэм з падручніка і ўзнікае не з праграмы, а ад цікавасці і патрэбаў дзяцей [3]. Мы звярнулся да тэмы міфалогіі невыпадкова. Па-першае, таму, што міфалогія самым цесным чынам звязана з мастацтвам, мовай, светапоглядам народа. Па-другае, міфалогія з'яўляецца важным кампанентам філалагічнай адукацыі малодшых школьнікаў. Па-трэцяе, тэма праекта, на наш погляд, адпавядае інтарэсам малодшых школьнікаў, іх веры ва ўсё таемнае і чароўнае.

Аднак мы былі вельмі акуратныя пры выбары тых істот, з якімі будуць знаёміцца навучэнцы: выбар быў абмежаваны тымі персанажамі, якія не з'яўляюцца для дзяцей залішне страшнымі.

Праца над праектам у пачатковай школе павінна быць арганізавана па мікрагрупах, у кожнага ўдзельніка якой павінна быць свая роля.

Падзел на групы дазваляе размеркаваць абавязкі, навучыць працаваць у камандзе, улічваць індывідуальныя здольнасці вучняў. Але пры вылучэнні груп у класе узнікалі пэўныя цяжкасці. У аснове падзелу на групы не павінны ляжаць сяброўскія адносіны, бо ў такім выпадку ёсць небяспека выдзялення, адасаблення гэтых вучняў ад групы, у якой яны выконваюць працу, або наадварот, цеснае аб’яднанне большай часткі групы, акрамя аднаго ці некалькіх вучняў.

Таму на этапе «Вывучай і даследуй» мы падзялілі вучняў на групы з дапамогай настаўніка. Пры гэтым улічвалі асаблівасці і моцныя бакі вучняў. Выкарыстанне фішак для падзялу на групы і разбіццё па асабістай зацікаўленасці вучняў палягчала гэту задачу. У кожнай групы было сваё заданне, вынікам якога было стварэнне пэўнага прадукта. Заданні падзяляліся паміж групамі, а кожны вучань працаваў у межах сваёй ролі. Настаўнік павінен дапамагчы з размеркаваннем гэтых роляў, калі вучні не могуць зрабіць гэта самастойна.

Ролі ў групе, якая працуе над праектам, могуць быць размераваны прыкладна так [4, с. 31]: арганізатар, які адказвае за працу групы ў цэлым; дакладчык, які выступае перад класам з гатовым рашэннем групы; сакратар, які занатоўвае ўсе выказаныя ідэі, гіпотэзы, рашэнне групы; крытык, які выказвае супрацьлеглы пункт гледжання; кантралёр, які правярае, ці ўсе зразумелі прынятае рашэнне.

Нават пры самай добрай арганізацыі праекта настаўнік павінен быць гатовы сутыкнуцца з пэўнымі праблемамі. Так, пры рэалізацыі праекта мы сутыкнуліся з цэлым шэрагам цяжкасцей.

Праект першапачаткова задумваўся як беларускамоўны, аднак далёка не ўсе навучэнцы пачатковыхкласаў добра валодаюць беларускай мовай. Таму мы рыхтавалі наглядны і тэарэтычны матэрыял, які дазваляў растлумачыць усе незнаёмыя паняцці.

Выкананне праекта было разлічана на 3-4 тыдні. Калі навучэнцы 3-4 класаў могуць з цікавасцю займацца праектам на працягу гэтага тэрміна, то вучням 1-2 класаў патрэбна дадатковая матывацыя на працягу выканання праекта.

Не ўсе вучні ў дастатковай ступені валодаюць навыкамі карыстання камп’ютара. Таму мы прапанавалі бацькам далучыцца да праекта і дапамагачы выканаць заданні.

Некаторыя вучні не праявілі цікавасці да тэмы праекта, а значыць, не былі актыўнымі. Таму пры аб’яднанні школьнікаў у групы мы пастараліся, каб у

кожным мікракалектыве былі зацікаўленыя і адказныя дзеці, якія дадаткова матывавалі сваіх таварышаў.

Л. С. Выгоцкі неаднаразова падкрэсліваў, што, перш чым заклікаць дзіця да якой-небудзь дзейнасці, неабходна зацікавіць яго. Таму студэнтамі-кіраўнікамі праектаў ствараліся ўступныя прэзентацыі, у якіх былі выкарыстаны розныя спосабы для ўключэння вучняў у работу над праектам: загадкі, рэбусы, казкі, праблемныя пытанні, расказы пра міфічных істот, урыўкі з вядомых мультфільмаў.

Такім чынам, у малодшым школьным узросце праектная дзейнасць уяўляе сабой спецыфічную навучальную дзейнасць, да якой павінны быць падрыхтаваны не толькі дзеці, але і настаўнікі. Рэалізацыя праекта прадугледжвае наяўнасць асноўных этапаў, характэрных для навуковага даследавання і арыентаваных на адкрыццё новых для навучэнца ведаў, фарміраванне даследчых уменняў. Выкананне пералічаных патрабаванняў і асаблівасцей рэалізацыі праектнай дзейнасці на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі забяспечыць цесную сувязь навучання з практыкай і будзе спрыяць фарміраванню творчай асобы, лінгвакультуралагічнай і камунікатыўнай кампетэнцый.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. Скворцова, М. А. Пути формированию лингвокультурологической компетенции средствами межпредметных интеграций в начальной школе [Электронный ресурс] / М. А. Скворцова. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/puti-formirovaniyu-lingvokulturologicheskoy-kompetentsii-sredstvami-mezhpredmetnyh-integratsiy-v-nachalnoy-shkole. – Дата доступа: 18.03.2024.

2. Пахомова, Н. Ю. Метод учебного проекта в образовательном учреждении: пособие для учителей и студентов педагогических вузов. – 3-е изд., испр. и доп. – М.: АРКТИ, 2005. – 112 с.

3. Сергеев, И. С. Как организовать проектную деятельность обучающихся : практич. пособие для работников общеобразовательных учреждений / И. С. Сергеев. – М.: АРКТИ, 2005. – 76 с.

4. Громыко, Н.М. Проектно-тематический подход к обучению дошкольников : пособие для педагогов дошкольных учреждений / Н. М. Громыко, И. В. Лапицкая. – Минск : Университетское, 2000. – 198 с.